**24.** Якія знакі прыпынку прапушчаны ў сказе на месцы пропуску?

*Уздзеншчына_ край жыватворных крыніц і салаўіных песень_ край адвечных легенд і паданняў_ калыска бацькі-Нёмана_ радзіма выдатных дзеячаў навукі культуры і мастацтва (М. Віяленцій).*

**А)** 4 коскі. **Б)** працяжнік, 3 коскі. **В)** працяжнік, 2 коскі, працяжнік.
**Г)** двукроп'е, 3 коскі. **Д)** 3 коскі, працяжнік.

---

**25.** Вядомая асветніца і мецэнатка з беларускага шляхецкага роду Завішаў герба "Лебедзь" Марыя Магдалена Радзівіл аказала фінансавую дапамогу першай легальнай беларускай выдавецкай суполцы "Загляне сонца і ў наша ваконца". Яна спансіравала першую беларускую газету "Наша ніва". Якія першыя кнігі класікаў беларускай літаратуры былі надрукаваны за яе грошы?

Выберыце патрэбныя варыянты:

1) "Вянок"Максіма Багдановіча; 2) "Курганная кветка" Канстанцыі Буйло;
3) "Рунь" Максіма Гарэцкага; 4) "Васількі" Ядвігіна Ш.;
5) "Родныя з'явы" Тараса Гушчы.

**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** толькі 1. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**26.** Як вядома, у старабеларускім пісьменстве "ў" не ўжывалася. Толькі ў 1870 годзе мовазнавец П. А. Бяссонаў прапанаваў выкарыстоўваць літару **ў** для пазначэння адпаведнага гука ў беларускіх тэкстах. Якімі літарамі абазначалася "ў" у словах да 1870 года?

*1) у; 2) ф; 3) в; 4) ы; 5) л; 6) н; 7) ы.*

**А)** 1, 2, 4. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 5, 7.

---

**27.** Вучні атрымалі заданне сабраць матэрыял для напісання творчай работы пра вызваленне Мінска ад фашысцкіх захопнікаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пятрок не змог знайсці звесткі на адно пытанне: у якім годзе сталіцы Беларусі Мінску было прысвоена ганаровае званне «Горад-герой»? Дапамажыце хлопчыку.

**А)** у 1945. **Б)** у 1954. **В)** у 1964. **Г)** у 1974. **Д)** у 1984.

---

**28.** Касцярэзы выразалі з косці грабяні, гузікі і шахматныя фігуркі, кавалі працавалі ў кузнях. А чым займаліся бондары?

**А)** майстравалі бочкі. **Б)** клалі печы. **В)** выраблялі ўпрыгожанні.
**Г)** рабілі з гліны міскі, збаны. **Д)** шылі адзенне.

---

**29.** *«Мой родны кут, як ты мне мілы!»* – гэтыя словы Якуба Коласа сталі ўжо сёння … .

**А)** прымаўкай. **Б)** афарызмам. **В)** фразеалагізмам. **Г)** загадкай. **Д)** словазлучэннем.

---

**30.** Хто з вядомых старажытных філосафаў у свой час сказаў: «Я ведаю, што я нічога не ведаю»?

**А)** Гіпакрат. **Б)** Сакрат. **В)** Дэмакрыт. **Г)** Піфагор. **Д)** Геракліт.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 24300 экз. г. Мінск. 2020 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2020»

*Чацвер, 20 лютага 2020 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі, у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Мабыць, з дзяцінства кожнаму помняцца словы песенькі-забаўлянкі:

*Ладкі-ладушкі, Селі на варотах*
*Прыляцелі птушкі, У … ботах.*

Які прыметнік прапушчаны?

**А)** зялёных. **Б)** чырвоных. **В)** жоўтых. **Г)** шэрых. **Д)** блакітных.

---

**2.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку, ужытых у вершаваных радках К. Цвіркі, маюць два склады?

*Абрус – абцас – азярод – арэлі… Як міла пазвоньваюць, сэрца грэючы,*
*Вясёлка – вырай – вярба – ваўчкі… Чыстых бацькоўскіх слоў ланцужкі.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

---

**3.** Чым з'яўляецца падкрэсленае спалучэнне слоў у сказе?

*Раска, як русалчына луска, на вадзе ад месяца гарыць (У. Караткевіч).*

**А)** зваротам. **Б)** выклічнікам. **В)** пабочнай канструкцыяй.
**Г)** параўнаннем. **Д)** устаўной канструкцыяй.

---

**4.** Якому ўстойліваму спалучэнню адпавядае лексічнае значэнне 'найбольш слабае месца каго-небудзь, чаго-небудзь'?

**А)** яблык разладу. **Б)** ахілесава пята. **В)** баяцца свайго ценю.
**Г)** бабіна лета. **Д)** як серада на пятніцу.

**5.** Акіянарый для развядзення дэльфінаў з мэтай іх вывучэння, дрэсіроўкі і паказвання наведвальнікам называецца … .

**А)** дэльфіній. **Б)** дэльфінарый. **В)** дэлювій. **Г)** акварыум. **Д)** акванаўтыка.

---

**6.** Колькі дзеясловаў у форме цяперашняга часу ўжыта ў вершаваных радках С. Шушкевіча?

| | |
|---|---|
| *У дыяментах снег наўкол,* | *Мігцяць, іскрацца, свецяцца.* |
| *Аж месяц з высі дзівіцца.* | *Бярозы сталі ў дазор* |
| *Усё маўчыць, і мноства зор* | *З нахіленымі веццямі.* |

**А)** 0. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**7.** Пра якую пару года (час работы) у народзе гавораць: *«Дзень цёмны, ды ноч светлая»*?

**А)** пра вясну. **Б)** пра лета. **В)** пра восень. **Г)** пра зіму. **Д)** пра касьбу.

---

**8.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў сказе?

*Раслінападобныя арнаменты былі надзвычай папулярнымі ў мастацтве барока, і іх адметная складаная пластыка запатрабавала ўдасканалення разьбярных тэхналогій і тым самым абумовіла росквіт майстэрства разьбяроў.*

**А)** 0. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

---

**9.** Выберыце з дадзеных правільна ўтворанае(-ыя) словазлучэнне(-і).

*1) вераснёвая ноч; 2) вераснёўскае паветра; 3) вераснёвы дзень.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**10.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

*1) р..монт; 2) ж..рдзіна; 3) т..рапеўт; 4) ж..стыкуляцыя.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**11.** У народзе часам можна пачуць: *«Рыбы (грыбоў, ягад) у гэтым годзе –* ***хоць апалонікам чэрпай****»*. Якое значэнне мае выдзеленае спалучэнне?

**А)** многа. **Б)** мала. **В)** няма. **Г)** рукамі не возьмеш. **Д)** не руш.

---

**12.** Дадзены словазлучэнні:

*1) малад.. гусь; 2) спакойн.. жырафа; 3) паслухмян.. сабака; 4) выразн.. подпіс.*

Выберыце прыклады, дзе ў прыметніках на месцы пропуску напішаце канчатак ***-ы***.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**13.** У народзе захавалася са старажытнасці:

*а) снежань вясне – …; б) студзень вясне – …; в) люты вясне – … .*

Выберыце патрэбныя варыянты:

*1) сын; 2) дзядзька; 3) бацька; 4) дзядуля; 5) прадзядуля.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-5. **В)** а-2, б-3, в-4.
**Г)** а-4, б-3, в-2. **Д)** а-5, б-4, в-3.

**14.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ў***?

*1) со..с; 2) жа..ток; 3) джо..ль; 4) ліноле..м.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**15.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова ў сказе?

***Віцебск*** *– сапраўдны горад мастакоў і паэтаў.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**16.** Падбярыце сінонімы да слова ***манумент***.

*1) мемарыял; 2) помнік; 3) скульптура.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**17.** У якіх прыкладах напішаце часціцу ***не*** разам?

*1) (не)дарэчнасць; 2) (не)забудка; 3) (не)прыяцель.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**18.** Вучні атрымалі заданне падабраць да дадзеных назоўнікаў адпаведнікі на беларускай мове.

Ігнат запісаў: *ворон – коршак, выпь – бугай, чибис – пліска, трясогузка – кнігаўка, ястреб – крумкач.*

Макар запісаў: *ворон – крумкач, выпь – бугай, чибис – кнігаўка, трясогузка – пліска, ястреб – коршак.*

Юрась запісаў: *ворон – бугай, выпь – крумкач, чибис – коршак, трясогузка – кнігаўка, ястреб – пліска.*

Хто з вучняў зрабіў правільны запіс?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Ігнат. **Г)** Макар. **Д)** Юрась.

---

**19.** Выберыце правільна напісанае народнае выслоўе.

**А)** пасеіш учынак – пажнеш прывычку. **Б)** пасеяш учынак – пажнеш прывычку.
**В)** пасееш учынак – пажнёш прывычку. **Г)** пасееш учынак – пажнеш прывычку.
**Д)** пасешь учынак – пажнешь прывычку.

---

**20.** Якія з дадзеных слоў напішаце праз злучок?

*1) (анлайн)гульня; 2) (экспрэс)інфармацыя; 3) (электра)дынаміка; 4) (фота)кадр.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**21.** Мікола з дзяцінства марыў навучыцца іграць на … .

**А)** акардэоне. **Б)** акардыоне. **В)** акардзіёне. **Г)** акардыёне. **Д)** акардэёне.

---

**22.** Якія з дадзеных слоў напісаны правільна?

*1) абедзьве; 2) водгуле; 3) вестэбюль; 4) гігантскі.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варынтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**23.** Як называлі раней у народзе наплечную сумку для пераносу прадуктаў?

**А)** карэц. **Б)** ліштва. **В)** ангоб. **Г)** вярэнька. **Д)** аканіца.